Самыя буйныя прадпрыемствы па вытворчасці вапны і гіпсу працуюць у Віцебску і Мінску. Вытворчасць блокаў і панэлей, бетонных і жалезабетонных канструкцый засяроджана ў Мінску, Магілёве, Оршы, руберойду — у Асіповічах.

Якая сыравіна неабходная для вытворчасці вапны і гіпсу?

**5. Вытворчасць нярудных будаўнічых матэрыялаў.** Прадпрыемствы гэтай падгаліны спецыялізуюцца на здабычы, драбненні і ўзбагачэнні будаўнічага каменю, друзу, жвіру, будаўнічага пяску. Найбуйнейшыя прадпрыемствы знаходзяцца ў Мікашэвічах (Брэсцкая вобласць) і Мінску.

**Падвядзём вынікі.** Вытворчасць будаўнічых матэрыялаў арыентуецца на ўласную сыравіну і спажыўца. Беларусь спецыялізуецца на вытворчасці цэменту, вапны, цэглы, бетону, зборных жалезабетонных і бетонных канструкцый, будаўнічага шкла, керамічных вырабаў.

***Праверце сябе.*** 1. Назавіце асноўныя фактары размяшчэння вытворчасці будаўнічых матэрыялаў. 2. У якіх цэнтрах арганізавана вытворчасць шкла і вырабаў са шкла, керамічных вырабаў? 3. Якія віды прадукцыі выпускае цэментная прамысловасць?

***Праблемныя пытанні.*** 1. Чаму з кожным годам узрастае роля вытворчасці будаўнічых матэрыялаў у Беларусі? 2. Якія існуюць перспектывы і магчымасці развіцця вытворчасці будаўнічых матэрыялаў?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Вам трэба выступіць на будаўнічым форуме і паказаць вытворчасць будаўнічых матэрыялаў у Беларусі. Распрацуйце для свайго выступу буклет «Прадукцыя вытворчасці будаўнічых матэрыялаў».

## § 37. Геаграфія дрэваапрацоўчай, мэблевай і цэлюлозна-папяровай прамысловасці

***Успомніце.*** *Чаму дрэваапрацоўчая, мэблевая і цэлюлозна-папяровая прамысловасць адносіцца да адной з найстарэйшых галін гаспадаркі?*

**1. Структура і фактары размяшчэння дрэваапрацоўчай прамысловасці.** Дрэваапрацоўчая прамысловасць — адна з найстарэйшых і найважнейшых галін прамысловасці Беларусі. Галіна ўключае групу вытворчасцей, звязаных з нарыхтоўкай, механічнай і хімічнай апрацоўкай драўніны (мал. 124).

У структуры апрацоўчай прамысловасці Беларусі на долю апрацоўкі драўніны і вытворчасці вырабаў з дрэва прыпадае каля 7 %. Найбуйнейшыя прадпрыемствы дрэваапрацоўкі аб’ядноўвае канцэрн



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Дрэваапрацоўчая, мэблевая і цэлюлозна-папяровая прамысловасць**

- Лесапілаванне
- Вытворчасць мэблі
- Цэлюлозна-папяровая вытворчасць
- Дрэваапрацоўка:
  - вытворчасць фанеры
  - вытворчасць драўняна-стружкавых і драўняна-валакністых пліт
  - вытворчасць запалак
  - вытворчасць драўляных будаўнічых канструкцый і сталярных вырабаў

Мал. 124. Структура дрэваапрацоўчай, мэблевай і цэлюлозна-папяровай прамысловасці Беларусі

«Беллеспаперапрам». У яго склад уваходзіць 50 прадпрыемстваў у Гомелі, Добрушы, Маладзечне, Пінску і інш. Асноўным фактарам развіцця дрэваапрацоўкі з'яўляецца сыравінны. Лясныя рэсурсы — важнае прыроднае багацце Беларусі. Гістарычна прадпрыемствы дрэваапрацоўкі размяшчаліся на берагах рэк. Іншыя спрыяльныя фактары: наяўнасць кваліфікаваных кадраў, рост аб'ёмаў будаўніцтва, устойлівы попыт на знешнім і ўнутраным рынках.

> Чаму прадпрыемствы дрэваапрацоўчай прамысловасці размешчаны на берагах рэк?

Сыравінную базу для дрэваапрацоўкі стварае лесапілаванне. Размяшчэнне прадпрыемстваў лесапілавання абумоўлена геаграфіяй лесанарыхтовак. Лесапілаваннем займаюцца каля 1,6 тыс. прадпрыемстваў краіны. У Барысаве і Бабруйску дзейнічаюць самыя буйныя лесакамбінаты, на кожным з якіх штогод распілоўваецца каля 100 тыс. $м^3$ сыравіны.

> З якой драўніны вырабляюць фанеру?

**2. Размяшчэнне вытворчасці дрэваапрацоўчай прамысловасці.** Важнай часткай дрэваапрацоўкі з'яўляецца вытворчасць фанеры. У Беларусі фанеру вырабляюць на прадпрыемствах Бабруйска, Гомеля, Рэчыцы і іншых гарадоў (мал. 126). Больш за 80 % выраблenай фанеры ідзе на экспарт.



Мал. 125. На прадпрыемстве «Рэчыцадрэў», г. Рэчыца. Вытворчасць ДСП

Вытворчасць драўняна-стружкавых і драўняна-валакністых пліт (ДСП і ДВП) засяроджана на прадпрыемствах у Барысаве, Рэчыцы, Пінску і іншых гарадах (мал. 125). Вытворчасць ламінаваных пліт наладжана на прадпрыемствах у Віцебску, Мастах, Івацэвічах (мал. 126).

**Мінск (1)**

**«Мінскпраектмэбля», «Мінскмэбля»:** мэбля
**Кіруючая кампанія холдынга «Беларускія шпалеры»:** шпалеры

**Барысаў (2)**

**«Барысаўдрэў»:** фанера, ДВП, пліты МДФ, запалкі
**«Барысаўскі ДАК»:** ДВП
**«Папяровая фабрыка Дзяржзнака»:** папера, бланкі строгай справаздачнасці

**Вытворчы лесаперапрацоўчы ўчастак «Закрэўшчына» (3):** драўляная тара
**«Маладзечнамэбля» (4):** мэбля

**«Віцебскдрэў» (5):** ДВП, пліты МДФ, ламінаваныя пліты, драўляныя вырабы
**Папяровая фабрыка «Чырвоная зорка» (філіял ААТ «Светлагорскі ЦКК») (6):** кардон гафрыраваны

**«ЗОУ ГАНДАЛЬ МЭБЛЯ» (18):** мэбля
**«Мастоўдрэў» (19):** фанера, пліты МДФ, ламінаваныя пліты
**«Слоніммэбля» (20):** мэбля
**Слонімскі кардонна-папяровы завод «Альберцін» (20):** кардон, папера, кардонныя папкі для папер, санітарна-гігіенічныя вырабы (сурвэткі і інш.)




1. Мінск
2. Барысаў
3. Узда
4. Маладзечна
5. Віцебск
6. Чашнікі
7. Магілёў
8. Бабруйск
9. Шклоў
10. Гомель
11. Жлобін
12. Рэчыца
13. Светлагорск
14. Добруш
15. Пінск
16. Івацэвічы
17. Целяханы
18. Гродна
19. Масты
20. Слонім

**«Магілёўдрэў» (7):** мэбля
**«ФанДАК» (8):** фанера, ДСП, драўляныя вырабы, мэбля
**Завод газетнай паперы (9):** папера газетная, друкарская, упакавачная

**«Пінскдрэў» (15):** фанера, ДСП, драўляныя вырабы, мэбля
**«Івацэвічыдрэў» (16):** ДСП, ламінаваныя пліты, мэбля
**Філіял «Целяханы» УП «Беларусьторг» (17):** лыжы

**Гомель (10)**

**«Гомельдрэў»:** фанера, пліты МДФ, ламінаваныя пліты, мэбля
**Гомельская мэблевая фабрыка «Прагрэс»:** мэбля
**Філіял «Гомельшпалеры» ААТ «Беларускія шпалеры»:** шпалеры

**«Жлобінмэбля» (11):** мэбля
**«Рэчыцадрэў» (12):** фанера, ДСП, мэбля
**Светлагорскі цэлюлозна-кардонны камбінат (13):** цэлюлоза, папера, кардон
**Філіял «Добрушская папяровая фабрыка "Герой працы"» ААТ «Беларускія шпалеры» (14):** папера, сшыткі, кардон

Мал. 126. Прадпрыемствы па вытворчасці дрэваапрацоўчай, мэблевай і цэлюлозна-папяровай прамысловасці



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Многія прадпрыемствы выпускаюць пліты МДФ — драўняна-валакністыя пліты сярэдняй шчыльнасці з пілавіння. Значная колькасць прадукцыі экспартуецца.

«Гомельдрэў» — адно з найбуйнейшых і найстарэйшых прадпрыемстваў. Яно ажыццяўляе поўны цыкл вырабу прадукцыі: ад лесанарыхтоўкі да гатовых відаў прадукцыі. Сёння на прадпрыемстве выпускаецца больш за 300 відаў прадукцыі, у тым ліку ламінат. Вытворчасць ламінату адзначана ў 2025 г. Дзяржаўным знакам якасці.

Вытворчасць запалак ажыццяўляецца на прадпрыемстве «Барысаўдрэў». Адно з найбуйнейшых прадпрыемстваў па вытворчасці драўлянай тары працуе ва Уздзе. Буйныя прадпрыемствы па вытворчасці драўляных вырабаў знаходзяцца ў Бабруйску, Віцебску, Пінску і іншых населеных пунктах. Адзінае ў Беларусі прадпрыемства па вытворчасці лыжаў працуе ў Целяханах (Брэсцкая вобласць).

**3. Фактары размяшчэння і геаграфія вытворчасці мэблі.** Вытворчасць мэблі — гэта адна з падгалін беларускай эканомікі, якая канкурыруе на роўных з заходнімі вытворцамі. Асноўным фактарам развіцця мэблевай вытворчасці з'яўляецца спажывецкі. Аб'ём мэблевага рынку залежыць ад узроўню даходаў насельніцтва, тэмпаў уводу ў эксплуатацыю новага жылля.

Калі крыху больш за 100 гадоў таму ў Беларусі існавала толькі адно прадпрыемства па вытворчасці мэблі — у Пінску, то цяпер канкурэнцыя ў дадзенай падгаліне дрэваапрацоўчай прамысловасці вельмі высокая. Чым гэта абумоўлена?

Вытворчасць мэблі ў Беларусі ажыццяўляюць больш за 1200 арганізацый розных формаў уласнасці. Вядучым з'яўляецца канцэрн «Беллеспаперапрам», доля якога складае больш за 30 % ад агульнага аб'ёму вытворчасці мэблі ў Беларусі. Буйныя вытворцы ў канцэрне — прадпрыемствы ў Бабруйску, Мінску, Пінску і іншых гарадах (мал. 126). У мэблевай вытворчасці шырока прымяняюцца натуральная драўніна і розныя сучасныя матэрыялы. Больш за 70 % мэблі канцэрна «Беллеспаперапрам» пастаўляецца ў Расію, Казахстан, ААЭ і іншыя краіны.

**4. Фактары размяшчэння і асноўныя цэнтры цэлюлозна-папяровай вытворчасці.** Адным з галоўных фактараў размяшчэння цэлюлозна-папяровай вытворчасці з'яўляецца водарэсурсны. У Рэспубліцы Беларусь

функцыянуе 12 профільных прадпрыемстваў. Штогод у краіне выпрацоўваецца больш за 260 млн т паперы і каля 60 млн т кардону, палова якіх экспартуецца. Найбуйнейшае прадпрыемства падгаліны — Светлагорскі цэлюлозна-кардонны камбінат.

Светлагорскі цэлюлозна-кардонны камбінат (мал. 127) найбуйнейшы ў Еўропе. Прадпрыемства таксама спецыялізуецца на вытворчасці цэлюлозы і ўнікальнага шматслойнага тоўсталістовага кардону. Асноўнымі спажыўцамі кардону з'яўляюцца беларускія і замежныя прадпрыемствы.



Мал. 127. Светлагорскі цэлюлозна-кардонны камбінат

Знайдзіце на мал. 126 прадпрыемствы цэлюлозна-папяровай прамысловасці і прадукцыю, якую яны выпрацоўваюць.

Буйныя прадпрыемствы цэлюлозна-папяровай прамысловасці размешчаны і ў іншых гарадах Беларусі. На базе Мінскай і Гомельскай шпалерных фабрык, некаторых прадпрыемстваў цэлюлозна-папяровай прамысловасці сфарміраваны і паспяхова функцыянуе холдынг «Беларускія шпалеры».

Пакажыце на карце атласа (с. 58) цэнтры цэлюлозна-папяровай прамысловасці.

З развіццём цэлюлозна-папяровай вытворчасці ў краіне павялічваюцца аб'ёмы паліграфічнай і выдавецкай вытворчасці. Аснову паліграфічнай вытворчасці Беларусі складаюць 8 прадпрыемстваў рэспубліканскага падпарадкавання і 37 друкарань абласнога падпарадкавання, а таксама выдавецтвы «Беларускі Дом друку» (Мінск), «Сож» (Гомель).

**Падвядзём вынікі.** Асноўным фактарам развіцця дрэваапрацоўкі з'яўляецца сыравінны. Найбуйнейшыя прадпрыемствы дрэваапрацоўкі аб'ядноўвае канцэрн «Беллеспаперапрам». Беларусь спецыялізуецца на вытворчасці фанеры, ДВП, ДСП, мэблі, паперы і кардону.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

***Праверце сябе.*** 1. Назавіце асноўныя фактары размяшчэння дрэваапрацоўчай, мэблевай і цэлюлозна-папяровай прамысловасці. 2. Як можна ацаніць забяспечанасць Беларусі сыравінай для галіны? 3. Якія віды прадукцыі вырабляе дрэваапрацоўчая прамысловасць?

***Праблемныя пытанні.*** 1. Якія, на ваш погляд, перспектывы развіцця дрэваапрацоўчай прамысловасці? 2. Чаму ў Беларусі пашыраюць вытворчасць паперы і кардону?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Вашы сябры зацікавіліся тым, што ў Беларусі развітая вытворчасць мэблі. З дапамогай карты атласа (с. 58) распрацуйце для іх буклет «Вытворчасць мэблі».

# § 38. Геаграфія лёгкай прамысловасці

***Успомніце.*** *Якая сыравіна выкарыстоўваецца ў лёгкай прамысловасці?*

**1. Структура і фактары размяшчэння лёгкай прамысловасці.** Па характары прадукцыі, якая выпускаецца, у складзе галіны вылучаюцца тэкстыльная, швейная, гарбарная вытворчасць (мал. 128).

Прадпрыемствы лёгкай прамысловасці арыентаваны на наяўнасць працоўных рэсурсаў, таму ствараюцца ў цэнтрах развіцця цяжкай прамысловасці з вялікім попытам на мужчынскую працу, каб заняць працай жанчын. У Беларусі такімі цэнтрамі можна назваць Салігорск, Жодзіна і інш. Лёгкая прамысловасць накіравана на задавальненне попыту насельніцтва. Найбольш спрыяльныя ўмовы для развіцця лёгкай прамысловасці ў тых рэгіёнах, якія забяспечаны працоўнымі рэсурсамі і адначасова з'яўляюцца спажыўцамі гатовай прадукцыі. Важны фактар размяшчэння прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці — выгаднае эканоміка-геаграфічнае становішча.

Чаму выгаднае эканамічнае становішча з'яўляецца важным фактарам для развіцця лёгкай прамысловасці ў Беларусі?

| Лёгкая прамысловасць | |
|---|---|
| Тэкстыльная вытворчасць | тканіны (баваўняныя, ільняныя, ваўняныя, з розных матэрыялаў), ніткі, дываны і дывановыя вырабы |
| Швейная вытворчасць | адзенне, галаўныя ўборы, вырабы з футра, трыкатажныя вырабы, панчохі, шкарпэткі |
| Вытворчасць скур, вырабаў са скуры, абутку | скура, скураная вопратка, пальчаткі, сумкі, абутак |

Мал. 128. Структура лёгкай прамысловасці